Вольга Бабкова



...калі ж памірае каханьне, усё навокал
таксама застаецца на ранейшым сваім мейсцы,
адно чалавек робіцца памерлым,
жывучы сярод жывых...

# Дом на пярэсьпе

***Аповед***

*Кожны вір мае свайго вадзяніка...*
З міфаў Бацькаўшчыны.

Дом рос як на дражджах. Ужо нават мала хто са старажылаў мог прыгадаць невялікі лапік зялёнай пусткі вільготнай зямлі, што калісь дружна абыходзілі, спускаючыся з прыступак сваіх пад'ездаў, каб не змачыць у твані спрытныя зранку ногі. Сьцежкі ды бітыя тымі ж нагамі шляхі крэсьлілі навокал утравелага квадрату мудрагелістыя кругі ды стрэлы, абмінаючы і не дасягаючы зялёнай пустэчы, заціснутай з усіх бакоў старымі пяціпавярховікамі. Трава тут буяла па пояс, а каму і па восьпінку на руцэ, пад нагамі хлюпала, а сінія ды брунатныя стрыблі садзіліся блізу не на самыя шчокі. Яшчэ кажуць, летнімі вечарамі падымалася над гэтым месцам лёгкае воблака туману, якое, будучы асьветленым навылёт кухоннымі ды іншымі вокнамі блізкіх дамоў, клубілася над цёмным

месцам, нікуды не распаўзаючыся і праз ноч не зьнікаючы. З долу халаднаватымі зоркамі паглядалі ўгору праз аер надзвычай зыркія незабудкі, якія так любяць квітнець на мокрадзі.

Будаваць пачалі на пачатку восені. Жалезныя магутныя машыны абляпілі пустку з усіх бакоў, ушчаўшы зранку да позьняй ночы страшэнны лязгат і калатнечу. Шкло пазвоньвала ў шыбінах дамоў, зямля гула пад коламі цяжкіх механізмаў. Неўпрыкмет на месцы былой пусткі ўзьнік адпаведных памераў катлаван. Тлустая чорная зямля цяжкімі пластамі плюхалася з каўша экскаватару ў корабы грузавікоў, і тыя, буксуючы ў гразкім бездарожжы, перакошаныя ад ношы, цягнуліся адзін за адным кудысьці за край гораду. Пасьля іх замянілі на больш магутныя машыны, і неўзабаве на месцы былой зялёнай роўнядзі зеўрыла ў нябёсы глыбокая чорная яміна-катлаван.

Неспадзеўка пачалася на золку наступнага дня. Пабуджаныя нечаканай цішынёй, жыхары блізкіх дамоў наўзьдзіў пачулі ў сваіх пакоях сьвежы водар ракі. Катлаван быў амаль на палову запоўнены вадой, у якой адбіваліся халаднаватыя цені аблокаў. Вады было дастаткова, каб восеньскі ветрык утвараў на яе серабрыстай паверхні лёгкі зыб. Праз некалькі дзён вады ў копанцы пабольшала, і разгубленыя будаўнікі, адклаўшы на час свае чарцяжы ды праекты, паглыбіліся ў вывучэньне старой мапы, што замовілі са сховішчаў блізкага ад месца здарэньня архіву. Рэчышча старой ракі, як сьведчыла мапа, праходзіла на значнай адлегласьці ад будоўлі, але ж крыніцы ўсё яшчэ бруіліся глыбока пад зямлёй, жывіліся нябачнымі токамі. З вышыні птушынага лёту квартал гэтай часткі гораду амаль супадаў з выявай на старой архіўнай мапе. Паабапал ручва высахлай ракі расьлі магутныя вязы, купіны буйной расьліннасьці прыходзілся на крынічныя мясціны, зрэзаныя пагоркі ўсё адно цягнулі ўгору стаптаныя макаўкі.

З якога такога арэшка струменіла нябачная вада, але ж гіганцкія помпы ня здолелі даць ёй рады. Хіба што, счакаўшы, калі ўзровень вады трохі памяншаўся, натурыстыя далакопы коштам вялікіх намаганьняў утыркнулі-такі на дно бетонныя палі і сталі чакаць маразоў.

Лістапад выдаўся сьцюдзёны ды празрысты, як шкло. Пахукаць — запацее, упусьціць — расколецца на шмат гострых аськепкаў. Маразы надышлі, не раўнуючы, — калядныя. Ваду ў катлаване скаваў да самага дна сьвежы лёд. Цяпер карціна будоўлі выглядала надзвычай фантасмагарычна. Пасярод роўнай, амаль шкляной паверхні, тырчэлі самотныя шэрыя палі, бы калоны ад храма даўняй антычнай эпохі. На колькі дзён, пакуль падвозілі матэрыялы, мясцовыя дзеці акупавалі гэтае нязвыклае месца для гульні на каньках у даганялкі і хованкі на лёдзе паміж «калонамі».

З дапамогай расшыральнага бетону ўрэшце замацавалі пляцоўку, і далей справа пайшла надзвычай хутка. Ужо да сярэдзіны наступнай восені на той самай пустцы ўзвышаўся над дахамі шэрых дамкоў стромкі белы хмарачос на адзін пад'езд, падобны адначасова на вежу і чымсьці на карабель, гатовы вось-вось скрануцца ды рушыць у самотнае плаваньне.

### III

Соня пад'язджала глядзець на сваё новае жытло, яшчэ калі ў доме

ішлі абліцовачныя работы. Пад нагамі шкамуцела будаўнічае сьмецьце. Сьвежы пыл зацярушыў навюткае шкло квадратовых вокнаў; пакрыў шэраньню каляровы глянец кафлі. Карцела падняцца на свой паверх, зазірнуць у кватэру, а то і пастаяць на гаўбцы, паўглядацца ў краявіды. Так агоркла ўжо туляньне па інтэрнацкіх закануркаx за пяцігоддзе жыцьця ў сталіцы. Усяленьне ў новы дом планавалася на вясну наступнага году. У гэтым быў пэўны знак. Вясна распачынала новы парадак, і ў Сонінай галаве складаўся новы расклад на жыцьцё. Хацелася б ўсё пачаць ад чыстага аркушу, адпрэчыцца ад уласных забабонаў, старых дачыненьняў. Яна прагла адчуць сябе вольнай ад сваяцкіх надакучлівых умяшальніцтаў ва ўласнае жыцьцё, дакорлівых поглядаў бабкі Ядзі, адчужанасьці старэйшай сястры. Калісьці вялікая іх сям'я цяпер здрабнела ды патроху расьцярушылася па сьвеце. Бацькі ўжо не жылі, і Соня сапраўды адчувала сябе засохлым карэньчыкам, ну хоць бы і шыпшыны, але ж жухлай, змарнелай, бяз цьвету і водару. Баба Ядзя жыла непадалёк ад Менску, але бачыліся яны гады ў рады без імпэту і асаблівай цеплыні. Чаму? Часам Соні здавалася, што бабка мелася штосьці паведаць ёй, вачыма клікала бліжэй да сябе ды, здаецца, з гадамі губляла і розум, і памяць. У рэдкія апошнімі гадамі сустрэчы пыталася пра неістотныя для Соні рэчы, змаўкала ці-то сьпявала паціху нешта пра далёкую рэчку Дунай. Таму ў Заслаўе Соня езьдзіла ўсё радзей і радзей.

Якая яна была, тая Соня? Няпэўныя рысы, размытае ўражаньне. Яе ўнутранае жыцьцё, думкі неяк не супадалі з тварам, унікалі яго. Адбывалася разыходжаньне, зьбівалася рэзкасьць, губляўся фокус. Нібы яна і тут, а праявіць сябе, заявіць сваю прысутнасьць ня ў стане. Ходзяць дзьве такія Соні на паўкроку адна ад адной. Усё мусіла перамяніцца з пераездам у новае жытло! Жыцьцё — нанова! Трэба было павыкідваць з галавы замшэлыя, сьлізкія камяні сумненьняў, як бы вызваліць на волю з запруды хуткую плынь, павымятаць павуту сваіх ды чужых жахаў. Вызваліць душу для чагосьці сапраўды вартага.

Дом сустрэў першых жыхароў амаль у поўным маўчаньні. Дзьверы не рыпелі і ня ляпалі, вецер загразнуў недзе звонку, не галосячы звыкла ў трубах. Адно гучна крапала недзе вада, быццам з незакручанага як сьлед крану. Першыя ж гукі галасоў, што вымаўляліся пад час неабходнага знаёмства суседзяў на лесьвічных пралётах, прагучалі як бы знутры якой студні — голасна, вільготна, з ледзь чутным водгульлем рэха. Соня была рада прычыніць за сабой дзьверы ўласнай кватэры, бы адрэзаць кавалак таго густога калідорнага паветра, у якім як ў ваце патанулі галасы будучых суседзяў па пляцоўцы.

Шпалеры для свайго пакою Соня выбрала белыя-белыя. Калі ўжо з новага аркуша, дык з самага чыстага! Хопіць азірацца. Тут у высотным доме так вабіць далячынь, якая праглядаецца ва ўсіх трох вокнах ейнай кватэры, ейнага хуткаснага лайнера пасярод аблокаў! Далей ад свайго мінулага жыцьця, прэч насамрэч! І чым хутчэй, тым лепей. Каб заквітнець буйным цьветам, трэба пусьціць новыя карані, не шкадаваць вады, каб не перасохлі, адшчапіць змарнелыя старыя, каб новая кроў пацякла праз новыя пуцявіны.

Першая ж ноч на новым месцы прынесла Соні незвычайны спакой. Так глыбока і соладка яна ня спала з маленства. Кладучыся, не забылася загадаць старое, з бабчынага: «На новым месьце хай прысьніцца жаніх

нявесьце!». Прысьніўся чыйсьці голас, але праз плюскатаньне вады было не разабраць словаў. Пасьля, прачнуўшыся, Соня вывудзіла з памяці пра сон яшчэ адзін пошум, які замінаў пачуць словы. Так калісьці шамацеў чарот, калі яе бацька рассоўваў вёсламі сухое сьцябло, прабіраючыся да берагу скрозь густы зарасьнік. А яна, Соня, крышыла пальцамі варсістую рудую галоўку чарота, здуваючы пасьля з каленяў мяккі паветраны пух.

Апоўдні яна ўжо ня згадвала пра голас, занятая ўладкаваньнем свайго новага жыцьця. Рэчаў было няшмат, ламачча і рызьзё засталіся па старым адрасе. Усё з нуля, усё з чыстага аркуша! Адмовілася нават ад альбому са старымі фотаздымкамі. Тых людзей ужо даўна няма ў яе жыцьці, унівеч абярнулася і памяць пра іх. Пакінула адно картку з бацькамі і немаўлём на руцэ. Ня ведала толькі яе ці сястру, укручанаю ў коўдру, трымае на здымку маці. Міжволі падумалася пра тое, што маці трымае ня проста скрутак з дзіцём, а лёс, які хтосьці ўклаў ёй у рукі. Прычым лёс пэўнага чалавека. Бо калі гэта сястра, дык гэта адзін лёс, а калі гэта Соня — дык зусім іншы.

Увечары, на пустой яшчэ кухні, Соня згатавала сабе зялёную гарбату. Пакуль тая настойвалася ў празрыстым цыліндрычным імбрыку, яе так моцна пацягнула на сон, што Соня разам з танцуючымі ў кіпені пялёсткамі язьміну павольна апусьціла галаў на рукі і правалілася кудысьці долу. Сон быў працягненьнем явы, адно што сьвет гарбаты памяняўся нейкім чынам месцам са сьветам, у якім яна была дагэтуль.

Жыцьцё, якое віравала ўнутры, патанала і нараджалася кожную хвіліну нанова. Бурштынавыя ясьвінкі сьвятла праціналі тут і там густую слаістую прастору ды высьвечвалі абрысы доўгіх цёмных сьцяблінаў, што цягнуліся ўгору, падобныя на ножкі рачных жоўтых гарлачыкаў. Яны павольна разгойдваліся, калышучы зьверху тое, што ў нас завецца небам. Нябачная апона затуляла гэты безбярэжны сьвет, кладучыся ценем на зьдзіўлены Сонін твар. Ізноў яе наведаў незвычайны спакой, нібы яна завітала ў госьці да нейкага вельмі надзейнага сябра, які з гатоўнасьцю прыняў на сябе ўсе ейныя турботы. «…тут, на том сьвеце, цяпер і заўжды…» шаптаў побач чыйсьці голас, поўны пяшчоты і спагады.

Апрытомнела Соня ад прыступу блізкіх ванітаў, бы яе хто кульнуў зьверху ўгару нагамі ды напхаў поўны рот нейкай гострай драбязы, якая да таго ж яшчэ сьмярдзела пахам потных далоняў, што з квадранец часу шоргалі па парэнчах электрацягніка. Рот расьпірала, душыў металёвы пах, ваніты падбіраліся вышэй, і ўрэшце-ткі Соніна нутро скаланулася ды выпхнула з сябе ўсю непатрэбшчыну, пасьля чаго, і праўда, ёй стала адразу вельмі лёгка. Зьбіраючы з падлогі, Соня прыгадала, што раней, па прыезьдзе ў кватэру, першае, што мусіла зрабіць, — сабраць у куце ды зьліць у вадасьцёк нейкую тваністую куламесу, бы рэшту засохлай ціны і водарасьцяў, абцягнутых ледзь прыкметнаю плеўкаю. Скуль тое ўзялося ў новым доме, Соня даўмецца не магла. Хіба што будаўнікі прыцягнулі адкульсьці на сваіх ботах, калі па нейкай там патрэбе прашкандыбалі па навюткім блішчастым паркеце ейнага пакою.

Вясна ўсталявалася позьняя, чым далей, тым больш мокрая: спачатку доўга таяў сьнег, пасьля над горадам навісьлі амаль нерухомыя, набрынялыя вільгацьцю воблакі-цэпеліны, з якіх амаль без перастанку церусіў не па-вясноваму знудлівы дожджык. Паветра пахла нябеснай вадой

упярэмешку з духам вільготнай зямлі. Вяртаючыся з працы, Соня найперш зачыняла фортку, з якой цягнула вільгацьцю, але шчодры пах вады не зьнікаў з кватэры і праз усю ноч.

Новае жытло мала што зьмяніла ў Сонінай штодзённасьці. Сястра па-ранейшаму адмоўчвалася, затое апошняя паездка ў Заслаўе да бабкі пасяліла ў душы шчымлівую пяшчоту. Старая, прытуліўшыся да яе на разьвітаньне, раптам зашаптала, зазіраючы ў вочы: «Зафейка, ці памятаеш той грабеньчык, што ляжаў у нас на камодзе, то гэта ж яго Рагнеда згубіла, калі на кані праз роў скакала, а я яго і падняла. Во там тыя рвы!», — махала рукой кудысьці ўбок. Бабуля — вядомая мудрагелька ды прыдумшчыца. З дзяцінства стаіць у Соніных вачах карцінка: баба Ядзя сядзіць жнівеньскім надвячоркам на ганку, узіраецца пільным вокам у край далягляду, услухоўваецца ў маўклівы ўжо бяз птушак сад, і сама сабе кажа весела так: «Лецейка-та — брык». Шмат чаго памятае Соня, не памятае толькі, з чаго тое сталася, што расцягнула іх усіх па розных кутах, сьцёршы да белаты мінулае, пакінуўшы хіба адно горкае шкадаваньне.

Ужо дома, выкладаючы з торбы бабчыны гасьцінцы, на вочы трапіўся тэкст з газеты, у якую быў загорнуты кавалак заслаўскага цьвёрдага сыру. *“Паездкі ў Беларусь асацыююцца ў мяне з навуковай фантастыкай. Гэта нейкі сюжэт пра расшчапленьне рэальнасьці ці пра паралельныя сусьветы. Я пачынаю разумець, што жыцьцё – гэта нейкая вадкая субстанцыя, якая можа набываць мноства розных нечаканых формаў…”* Пісаў гэта вядомы “чалавек-аркестр” з Украіны, які быў праездам у Менску, і словы гэтыя чымсьці моцна ўразілі яе і зноў вярнулі памяць пра сны, якія апошнімі часамі трывала запанавалі над яе думкамі.

У гэтую ноч вільгацьцю патыхала наймацней. Адчуваючы на сабе цёплы дотык коўдры, Соні тым ня менш падалося на паўкроку ад засынаньня, што яна проста-такі патанае, правальваецца ў мяккае воглае воблака, і раптоўная зяляніна шпалераў была апошнім, што зьдзівіла яе тут. А там ізноў быў спакой, цурчаньне вады і раптоўнае дакрананьне сухіх шурпатых вуснаў да яе, Соніных, крыху прыадкрытых у сьне.

Прачнуўшыся, Соня ляжала, баючыся паварухнуцца, страсянуць штосьці ўнутры, таму што тое, што там цяпер знаходзілася, ціснула такім салодкім цяжарам, пякло такім нясьцерпным вагнём, што на хвілю яна перастала адчуваць свае межы. У сьне хтосьці проста падышоў да яе і правёў далоньню ўздоўж цела — па валасах, плячы, сьцягну, па нагах, дакрануўшыся да самага мезінца. Пры гэтым другая частка цела заставалася халоднай і нямой на дотык, у той час як іншая залілася імгеннай гарачынёй. Чые гэта былі далоні Соні не было дадзена ведаць, таму што гэты хтосьці быў адначасова ўсімі яе знаёмцамі адразу. І тым ня менш, нейкі выразны ўспамін з мінулага проста прыціснуў яе да канапы.

*Яны сустрэліся вачыма ў бібліятэцы і неяк адразу скіраваліся да выхаду. Была сярэдзіна восені, апошні яе цёплы дзень, і гарадскі краявід з вакна, да якога яны падышлі не змаўляючыся, зьдзівіў абодвух. Дзьве нерухомыя вялікія цёмна-зялёныя елкі загостранымі вяршалінамі ўтыркаліся проста ў блакіт, ствараючы ўражаньне маўклівых пірамідаў на тле адыходзячай на час прыроды. Карціна за вакном рабіла дваістае ўражаньне. Здавалася, што елкі са сваёй стромкай*

*вертыкальнасьці, не скранаючыся з месца, выпростваліся да кругагляду і ператвараліся ў шлях, указвалі накірунак. Трэба было проста задоўжыць на іх погляд, а, можа быць, гэта называецца зьмяніць гледзішча. Дарога клікала, і яны пайшлі на гэты покліч.*

*Пазьней жыцьцё чыніла ім сітуацыі, калі зьмена арыенціру абрынала на іхнія плечы невядомыя дагэтуль адчуваньні. У каго з іх першага зламаўся гэты каштоўны пачуцьцёвы механізм — невядома, але тады, калі, здавалася, сьвет належыў толькі ім, адбылася страта. Елкі з вакна бібліятэкі яшчэ паказвалі шлях для абраных, але кожны з іх ужо вандраваў па сваім.*

Соня ледзь пеpажыла той год. Зрабіла ўсё магчымае, каб вызваліцца ад успамінаў. Пераезд у новы дом быў адным са спланаваных крокаў у гэтым напрамку. Разлад у яе сям'і таксама, мусіць, быў водгульлем на гэта. (Як бы Соні ні хацелася так думаць). Проста немажліва было тлумачыць сястры ды і старой тое, што ёй самой не ўкладалася ў галаве. Хацелася ўнікнуць усяго. З успамінаў таго перыяду найбольш выразным запомнілася пачуцьцё, калі даводзілася выходзіць у ноч з чужых асьветленых пакояў. З якой асалодай твар акунаўся ў выратавальную нямоту. Цемра рабілася прыязнай, сваёй. Нарэшце можна было адпачыць, загаіць стаптаны цікаўнымі паглядамі твар.

Прахалода, якая цяпер амаль заўсёды панавала ў доме, была насамрэч патрэбна Соні. Жарсьць і спакуса, гэтыя два пякучыя словы, з шыпеньнем правальваліся ў нейкія сьцюдзёныя воды, не пакідаючы нават бурбалак, ці можа быць адно бурбалкі і пакідаючы. Таму, прачнуўшыся пацалаванай, Соня баялася паварухнуцца. Каб не спужнуць, каб успомніць.

Тое, што пачало адбывацца з Соняй пазьней, ня мела для яе ніякіх тлумачэньняў. Чароды вобразаў цяклі ў яе душу амаль без перастанку, прынамсі, калі яна заставалася ў доме. (Хіба што апоўначы на кароткі час сьвядомасьць вызвалялася, расьцякалася спакойнай роўняддзю па-за ўласныя межы). …Пад млынавы грукат да яе даносіліся галасы ўзброеных людзей. Зьмест гаманы было ня ўцяміць, гаворка нагадвала птушыныя перагукваньні. Варта было пасунуць галаву на падушцы трохі ўбок, і відзежа квітнеючай яблыні запаланяла сабой усю прастору яе пакою (ці быў то пакой?). Дрэва, што ўвабралася ў самы росквіт, абтрасала ружовыя пялёсткі на цёмную галоўку малога пастушка, што сядзеў пад ім. Грукат млына раптоўна зьмешваўся з нарастаючым гулам падаючага з неба жалезьзя, і пасьля Соня ўжо ня бачыла, але чула плач і стогн многіх людзей. Ізноў чула плюскатаньне вады ды бачыла зьбялелыя вершаліны ўспоратага чароту, зялёныя пагоркі і горад на даляглядзе… .

Аднойчы ўначы праз сон ёй падалося, што хтосьці пазваніў у дзьверы. Соня дасюль ня ведае, ці падхапілася яна насамрэч, ці ўсё адбывалася пад час ейнага сну. Але калі яна ўзялася за клямку, дык раптам зразумела, што адчыніць дзьверы ня здолее, а калі б і магла, то забаялася, што ўяўная вада вырвецца з яе кватэры навонкі ды проста змые начнога госьця. І гэта было відавочна. Адно што ранкам Соня не магла ўцяміць, як жа сама яна магла знаходзіцца тут, да таго ж унізе таксама жылі людзі. Пасьля той начы Соня заўважыла зьмены ў сваёй кватэры. Яе белыя шпалеры пакрыліся тонкім, бы павуціньне, малюнкам, падобным на выявы вадзяных расьлінаў, а пад босымі нагамі дзе-нідзе

шамацеў белы рачны пясочак, бы хтосьці знарок рассыпаў зьмесьціва шклянога гадзіньніка. Соня баялася паверыць самой сабе.

Начны госьць прыйшоў наступным разам. Сон аказаўся ў руку: на парозе стаяў чалавек з мінулага. Яе нарачоны. Раптоўная хваля радасьці ледзь ня зьбіла Соню з ног. Усё адбылося амаль з дакладнасьцю да наадварот. Толькі цяпер гэта была зусім ня хваля сьцюдзёнай, звыклай вады яе асяроддзя. Мяккі штуршок у грудзі прымусіў Соню зрабіць крок назад ад расчыненых дзьвярэй, у паўцемру свайго пакою, якая сьцялася ў яе за сьпіной у прытоеным чаканьні.

Яны сядзелі на кухні і згадвалі сваё жыцьцё. Вечар успамінаў. Цяпер не праз сон, не праз мрою, а наўпрост – словамі, вачыма, вуснамі – твар у твар.

*Горад запальваў ліхтары, і яны сустракаліся на месцы Старога рынку. Амаль заўсёды на адным і тым жа месцы. Пасьля выбіралі кірунак сваіх блуканьняў. Менск датуль застаецца халодным і маўклівым для людзей, народжаных наводдаль ад яго, пакуль яны ня ўбачаць яго вачыма свайго каханьня. Мураваныя лаўкі не здаваліся халоднымі, калі яны сядалі на іх, а сьвятло чужых вокнаў сагравала тады, калі на начных вуліцах у твар дзьмуў ледзяны лістападаўскі вецер. Прытулкам былі чужыя пад'езды на прасьпекце і ў Старым горадзе, а варажба па сьценках пустых кававых філіжанак абяцала абодвум бясконцы працяг іхніх вандраваньняў. У канцы доўгага калідору ў будынку старога уніцкага кляштару яны грэліся адной каляднай ноччу ля гарачай батарэі. Пахла ваўнянымі Сонінымі рукаўкамі, сплеценымі заслаўскімі вечарамі бабуляй, а ён расьціраў яе тонкія пальцы, раз-пораз цалуючы кожны паасобку. "Твае белыя пальчыкі – барабанныя палачкі," — шаптаў і дзьмуў горача ў ейную жменьку, той малады музыка, аматар Малера і партугальскага джазу.*

Ён сышоў уначы, пакінуўшы ў падарунак ракавіну, даўгую, з зазубрынамі, якія сьпіральлю укручваліся і зьнікалі ў сярэдзіне глыбокай адтуліны. Зусім нетутэйшая, з далёкіх выспаў.

Рэшта ночы цалкам перакуліла Соніны ўяўленьні пра сьвет і пра сябе. Яна цягнулася бясконца доўга і адначасова прамільгнула, як бы яе і не было зусім. Але ці было насамрэч праўдай тое, што адбылося гэтай ноччу з Соняй, яна ня ведала. Цяпер яна ўвогуле нічога ня ведала! Той, хто абдымаў яе ў сьне гэтай ноччу, быў самой музыкай, што ўвабрала ў сябе пошум і гукі ўсяго наваколься. Толькі адкуль поруч са сьпевамі невядомых ёй птушак, — грукат і пляскат вадаспаду? А можа гэтак грукоча і рыпіць вялізарнае кола вадзянога млына ў кіпучай вадзе глыбокага ставу? Ці хтосьці вялікі і невядомы разгойдвае з самога дна азёрную паверхню. Пырскі ахіналі Соню з ног да галавы, але былі яны народжаныя хвалямі такой асалоды, што можна было зьнікнуць. Самой стаць мелодыяй, ветрам, вадой… Проста зьнікнуць.

Ракавіна ляжала на стале, павернутая да сьвятла маціцовым пляскатым бачком, роўна так, як яе паклалі. Праз шчыльна загорнутыя фіранкі тачылася рэдкае сьвятло. Калі памірае чалавек, жыцьцё працягваецца ва ўсіх сваіх вялікіх і малых дробязях, выяўляючы поўную абыякавасьць да зьніклага, але не абражаючы сваім бадзёрым працягам таго, хто выпадае з кола. Калі ж памірае каханьне, усё навокал таксама застаецца

на ранейшым сваім мейсцы, адно чалавек робіцца памерлым, жывучы сярод жывых.

Нарэшце яна знайшла адказ…

З працы вярталася амаль весела. Пазваніла з пошты бабулі. Зьдзівілася, наколькі родным падаўся ейны голас. Адразу ў цеснай кабінцы запахла водарам бабчынага хвартуха – часнык, кроп, сухая меліса, упярэмешку з махоркай, якой тая ўпарта пасыпала зямлю хатніх кветак, што буялі ў яе на падвоканьнях нават узімку. Бабуля клікала на Каляды ў Заслаўе, абяцалася штосьці падараваць. Ня верылася, што, павесіўшы цяпер слухаўку, Соня ўжо распачынае сыход уніз па калодзежных прыступках з гэтай паверхні, дзе згубілася і ніяк не знаходзіцца ейная радасьць. “Хто сказаў табе, што мы нараджаемся дзеля таго, каб быць шчасьлівымі?” — , запытаўся ў яе аднойчы знаёмы з дакорам у голасе. Гэтага дакору ёй хапіла з каптуром, каб больш ня бачыцца з сапраўды разумным чалавекам, бо яна ўжо добра ўмела розьніць сэнс сказанага ад інтанацыяў, з якімі яны былі прамоўленыя.

Зімовае сутоньне панавала ў кватэры. Соня ня стала запальваць сьвятла. Лягла на сьпіну на канапу і заплюшчыла вочы. Пошукі радасьці былі цяпер яе клопатам. Дзе яе гнёзды, прычыны, фарбы? Якія птушкі прыносяць яе ў дзюбах для спакутаваных? А можа сама Соня пераблытала і расказала сама сабе другую гісторыю, зусім ня з тым канцом. Яна ж была народжаная ў каханьні. Бабуля казала ім з сястрой, што яны проста абавязаныя быць шчасьлівымі, бо бацькі пражылі свой век, трымаючы адно аднаго за рукі. Проста сама Соня, падросшы, похапкам ускочыла не на той човен ды адплыла ад свайго берагу, забыўшыся запрыкмеціць шлях да вяртаньня. Колькі год яна адчайна грабе, каб наблізіцца да самой сябе, але, здаецца, човен рухаецца па коле. Тады, седзячы за сьпінай бацькі ў чаротавым зарасьніку, яна цьвёрда ведала, што ён абавязкова выруліць да патрэбнага месца, абмінаючы перашкоды. Цяпер жа, каторы год яе самотны човен шчэпкай гойдаецца па жыцьці. Перастаць варушыцца, лавіць плынь? Скарыцца волі хваляў, каб патануць у пластах вады, якая з такой настойлівасьцю грукаецца ў зачыненыя дзьверы яе памяці? Патануць, каб дастаць дна, шчакой дакрануцца да зыбучага пяску? Дык вось значыць, як шарасьціць час, сьцякаючы паміж пальцаў… . Марудна і хутка адначасова.

Здаецца, яна адчувае глыбіню гэтай прорвы споду году, гэтую нізіну, куды звальваюцца нязручнасьці, непамыслоты, незавершаныя спадзевы. Цёмная пара датуль, пакуль не ўваб’ецца ў сваю сярэдзіну сьнежань, не падбеліць прастору навокал, не наваліць гурбаў на чорную зямлю, усё вышэй і вышэй, пакуль яны не дастануць зімовага сонца…
.

Соня ўжо ня мела сілаў нацягнуць на сябе коўдру. Імгненнае жаданьне ўхутацца ў раптоўна схаладнелым пакоі згасла, ледзь пасьпеўшы ўзьнікнуць. Ніжэй, глыбей, туды, дзе гучыць голас, поўны пяшчоты і спагады. У забыцьцё.

Вада зьмяняе аблічча чалавека. Змывае напругу з твару, расслабляе цягліцы, вызваляе ўсьмешку, ярчэйшым робіць пагляд. Нібыта з неўсьвядомленай радасьцю мы кідаемся ў абдоймы свайго пачатку. І калі гульба з вадой прытоміць цела да салодкай зьнямогі, выпрастае яго нерухомым

лістком, сьвядомасьць расьцячэцца па вадзяной роўнядзі і адлюструецца ў ёй усё-усё, да самай апошняй драбніцы. Бо няма дробязі, ня вартай увагі, ёсьць панаваньне марнасьці, якое робіць сэрца пустым.

Соні падалося, што яна ўжо даўно ляжыць на глыбокім дне, хаця да паверхні дня, у якім яна прылягла надвячоркам на сьпіну на канапе, варта было толькі працягнуць рукой… Цела перастала слухацца і згубіла ўшыркі і ўдоўжкі свае межы. Ёй падалося, што яна пачала распускацца ў вадзе і вось-вось зьнікне сама, страціць сваё імя, але зрабіла глыток і адчула яго, значыць была яшчэ тут. Тут. А там зьнеадкуль пачуўся далёкі вокліч ейнай бабулі: “Зафейка!”. Раптам мяккі, моцны штуршок чыіхсьці вялікіх далоняў скрануў яе з месца, надаў яе целу рух і форму, і гэтая форма ізноў заняла сваё ранейшае месца ў прасторы. “Зафейка!” — бабуля наблізілася і ласкава паманіла яе да сябе, дастала з кішэні хвартуха драўляны грабеньчык ды правяла па доўгіх валасах унучкі. Раз, другі, трэці… . “Густыя валасы, як ва ўсіх кабет з нашага роду, Зафейка.” Бабуля гладзіла ды гладзіла няроўнай, шурпатай далонькай яе галаву, перабірала нягнуткімі пальцамі шаўковыя пасмачкі ды нягучна сьпявала сваё:

…А ў тым Дунае сам Бог купаўся.
Сьвяты вечар добрым людзям!
Галоўку схіліў — сьлёзачку зраніў.
Сьвяты вечар добрым людзям!
З тэя сьлёзачкі Дунай разьліўся.
Сьвяты вечар добрым людзям!...

Зафея прыслухоўвалася да гучаньня свайго новага імя. Як з мінулага жыцьця. Знаёмыя спалучэньні гукаў. Усё неяк пачало станавіцца на свае месцы. Яна павольна вынырвала з уласных глыбіняў, з радасьцю прыслухоўваючыся да гукаў навокал. Надыходзіла раніца: ізноў сутаргава закалацілася старэнькая лядоўня на кухні, забрахаў унізе ля пад’езду сабака, па мокрым асфальце пранёсься легкавік, зашаргацела пруцяная мятла ў руках дзядзькі Язэпа, вымятаючы з лужынаў позьняе лістападаўскае лісьце…

У Зафеі сёньня было шмат справаў. Упершыню за апошні час. Яна азірнулася на свой дом, стромкі белы хмарачос, падобны адначасова на вежу і чымсьці на карабель, калі была ўжо на другім баку вуліцы.